# «НЯХАЙ ЛЕПШЫЯ ПАДРУЧНІКІ БУДУЦЬ НАПІСАНЫ НАМІ...»

Такімі словамі завяршылі сваё выступленне студэнты-машэраўцы на міжнароднай навуковай алімпіядзе па педагогіцы, якая праходзіла ў межах Дэкады студэнцкай навукі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. Алімпіяда складалася з дыстанцыйнага (стварэнне педагагічнай каманды і выкананне тэставых заданняў) і фінальнага (падрыхтоўка індывідуальных дакладаў у жанры навуковага артыкула) этапаў. У апошнім прынялі ўдзел пяць каманд аспірантаў і восем каманд студэнтаў і магістрантаў з розных ВНУ Беларусі, а таксама з Яраслаўскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя К.Д. Ушынскага. Гонар нашай альма-матар адстойвалі хлопцы і дзяўчаты розных факультэтаў: Аляксей Альхавікоў (МГФ), Юлія Цеханская, Паліна Акуленка, Юлія Новікава, Алёна Шаўрова (БФ), Кірыл Філіпцоў, Максім Мухін-Градніцкі (ГФ) і аўтар гэтага артыкула.

Машэраўцы з усёй адказнасцю і сур'ёзнасцю рыхтаваліся да тэстаў, вынікі якіх залічваліся ў камандны і асабовы залікі. Грунтоўнай была падрыхтоўка і калектыўнага навукова-педагагічнага даследавання «Магчымасці зместу вучэбных прадметаў у фарміраванні каштоўнасных адносін школьнікаў». Дапамагалі нашым студэнтам загадчык кафедры педагогікі Н.А. Ракава і выкладчыкі А.А. Воранава, Л.С. Дзьячэнка, Р.У. Загарулька, І.Я. Кернажыцкая, В.У. Махіня, В.У. Цяцерына, А.А. Фаменка. Хлопцы і дзяўчаты працавалі са школьнымі падручнікамі, даследавалі іх змест, аналізавалі пытанні і практычныя заданні пасля кожнага параграфа. Напрыклад, студэнткі БФ Юлія Новікава і Алёна Шаўрова вывучалі падручнік па біялогіі (11 клас), у якім адзначылі важнасць тэм, прысвечаных экалагічным пытанням. Максім Мухін-Градніцкі з Кірылам Філіпцовым на прыкладзе матэрыялу падручніка па гісторыі Беларусі (10 клас) даследавалі маральна-патрыятычны аспект. Студэнт МГФ Аляксей Альхавікоў вылучыў шэраг заўваг і прапаноў па прадмеце «Выяўленчае мастацтва», які, дарэчы, у школе вывучаецца з першага па шосты клас. Такім чынам, кожны даваў каштоўныя парады па змесце школьных падручнікаў.

Прэзентацыя дамашняга каманднага задання праходзіла ў форме подыумнай дыскусіі з экспертамі-лідарамі педагагічнай навукі. Адказваючы на пытанні апанентаў з Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова, мы прадэманстравалі высокі ўзровень валодання тэмай. Як адзначыла кіраўнік нашай каманды Рэгіна Уладзіміраўна Загарулька, было цікава працаваць са студэнтамі розных факультэтаў, якія атрымалі карысны вопыт, паглыбілі свае веды па педагогіцы.

Напрыканцы алімпіяды былі падведзены вынікі. Наша каманда заняла трэцяе месца. А Максім Мухін-Градніцкі ў асабістым заліку ў намінацыі «Навуковая эрудыцыя» заняў другое месца.

**Юлія ПРЫШЧЭПА,**
**студэнтка 3 курса**
**ФлФ.**

**На здымку:** каманда студэнтаў-машэраўцаў разам з кіраўніком Р.У. Загарулька.

